Funded by the European Union

BELARUS BEEHIVE

Адукацыйны курс быў распрацаваны спецыяльна для платформы learn4belarus.online

# Фандрайзінг для грамадска-культурніцкіх праектаў

## Модуль 1. Грантавы фандрайзінг

### Дадатковы матэрыял да лекцыі 1.2

### Спецыфіка грантрайтынгу для культуры: як паказаць нематэрыяльнае ўздзеянне ў лічбах

## Шаблон гісторыі «Шлях героя»

> ***Інструкцыя:*** *Ніжэй прыведзены шаблон з 8 ключавых элементаў. Пасля кожнага пункта – месца для запаўнення, а таксама ўзор-прыклад тэксту.*
>
> ***Важна:*** *«герой» тут – не арганізацыя, а чалавек, чыё жыццё змянілася дзякуючы праекту.*

### 1. ЗАГАЛОВАК

Сутнасць змены ў адной фразе

| |
|---|
| |

***Прыклад:*** *«Як адзін архіў вярнуў жанчыне яе мову»*

### 2. КАНТЭКСТ І ВЫКЛІК

Якая праблема стаяла перад героем? Канкрэтна і з дэталямі

| |
|---|
| |

***Прыклад:*** *«Ганна з'ехала з Мінска ў 2021 годзе. У Берліне яна гаварыла толькі па-нямецку і па-руску. Беларуская мова, на якой яна вырасла, паступова сыходзіла з яе жыцця, таму што не было нагоды яе выкарыстоўваць."*

## 3. ВІЗІЯ

Што магло б быць інакш? Апішыце ідэальны сцэнар

***Прыклад:*** *«Калі такі чалавек прыходзіць на канцэрт беларускай музыкі або чытае беларускамоўны часопіс, у ім/ёй можа нешта змяніцца — ён/яна пачынаюць па-іншаму ўспрымаць гэтую частку сябе.»*

## 4. РЭАЛІЗАЦЫЯ

Што канкрэтна адбылося? Якія былі крокі?

***Прыклад:*** *«Ганна знайшла нашу платформу, пачала чытаць матэрыялы, слухаць музыку, удзельнічаць у анлайн-мерапрыемствах. Кожны дзень яна распавядала сябрам пра штосьці новае са сферы беларускай культуры.»*

## 5. ВЫНІК

Колькасныя і якасныя.

***Прыклад:*** *«Праз год пасля пачатку працы з платформай Ганна пачала весці дзённік па-беларуску. Яна кажа, што гэта першае, што яна робіць кожную раніцу. Яна таксама запрасіла сваіх сяброў на мерапрыемствы і цяпер яны ўсе гавораць па-беларуску раз на тыдзень.»*

## 6. ЦЫТАТА ЎДЗЕЛЬНІКА

***Прыклад:*** *«Я ніколі не думала, што мая мова можа гучаць так сучасна. Цяпер я хачу спрабую размаўляць па-беларуску са сваёй дачкой.»*

## 7. ВЫСНОВА (Сістэмны ўзровень)

Што гэта значыць НА СІСТЭМНЫМ УЗРОЎНІ? Гісторыя Ганны — гэта не толькі гісторыя Ганны, а гісторыя цэлага пакалення / сектара

***Прыклад:*** *«Гісторыя Ганны паказвае, як платформа культуры можа падтрымаць пакаленне беларускіх эмігрантаў у збераганні культурнай ідэнтычнасці. Праблема не ў нежаданні людзей захаваць мову, а ў адсутнасці інфраструктуры для гэтага. Наш праект будуе гэтую інфраструктуру.»*

## 8. ПАДЗЯКА

Хто зрабіў гэта магчымым? Партнёры, донары, супольнасці?

***Прыклад:*** *«Гэта стала магчымым дзякуючы грантадаўцам, якія фінансавалі платформу, тым медыя, якія распаўсюджваюць інфармацыю пра нас, і тысячам такіх як Ганна, якія стварылі супольнасць платформы»*